В.М. Лянцэвіч

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

*Вучэбна-метадычны комплекс*

**Мінск**
**Выд-ва МІК**
**2012**

УДК 947.6
ББК 63.3
Л 97

Р э ц э н з е н т ы :

**Тугай У.В.,** прафесар, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэднявечча БДПУ імя М. Танка;

**Самахвалаў Дз.С.,** канд. гіст. навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства БДУ

*Адобраны кафедрай гісторыі і тэорыі права Мінскага інстытута кіравання*
*(пратакол № 2 ад 14.09.2012 г.)*

**Лянцэвіч, В.М.**
**Л 97** Гісторыя Беларусі: вучэбна-метадычны комплекс / В.М. Лянцэвіч. – Мінск: Выд-ва МІК, 2012. – 304 с.

ISBN 978-985-490-843-4.

Вучэбна-метадычны комплекс дае магчымасць студэнтам дзённай і завочнай форм навучання авалодаць сістэмай ведаў аб асноўных этапах этнічнай гісторыі Беларусі, сацыяльна-палітычным, эканамічным, культурным і духоўным жыцці беларускага народа ў кантэксце гісторыі сусветных цывілізацый. У выданне ўключаны практыкум, дзе даюцца заданні для семінарскіх заняткаў, таксама кароткі тэрміналагічны слоўнік і храналагічная табліца асноўных падзей беларускай гісторыі.

Вучэбна-метадычны комплекс карысны для ўсіх, хто вывучае гісторыю Беларусі.

**УДК 947.6**
**ББК 63.3**

**ISBN 978-985-490-843-4**

© Лянцэвіч В.М., 2012
© Афармленне. МІК, 2012

# ЗМЕСТ

Ад аўтара ............................................................................5
Прадмова...............................................................................7
І. ПРАГРАМА КУРСА «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНЫХ ЦЫВІЛІЗАЦЫЙ ..............................9
ІІ. КУРС ЛЕКЦЫЙ ..................................................................26
Раздзел І. ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНАЯ СПАДЧЫНА СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ, СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ І БЕЛАРУСЬ.............26
Лекцыя 1. Першабытнае грамадства на тэрыторы Беларусі...............................................................26
Лекцыя 2. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях (IX – першая палова XIII ст.) .............................32
Лекцыя 3. Беларускія землі ў эпоху Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVI ст.) .........43
Літаратура да першага раздзела .......................................61
Раздзел ІІ. ЦЫВІЛІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ НОВАГА ЧАСУ І БЕЛАРУСЬ ............................................68
Лекцыя 4. Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – канец XVIII ст.)...........................68
Лекцыя 5. Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.)........................................84
Лекцыя 6. Беларусь у 1914–1918 гг. ............................103
Літаратура да другога раздзела ....................................111
Раздзел ІІІ. БЕЛАРУСЬ САВЕЦКАЯ (1919–1991). ЗАХОДНЯЯ БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ (1921–1939)..............................................................119
Лекцыя 7. БССР у міжваенны перыяд (1919–1939) ....119
Лекцыя 8. Заходняя Беларусь у складзе Польшчы (1921–1939)..............................................................128
Лекцыя 9. Беларусь у гады Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны (1939–1945)......................133
Лекцыя 10. Савецкая Беларусь: дасягненні і праблемы ствaральнай працы народа (1945–1991) ......................144
Літаратура да трэцяга раздзела ......................................160

Раздзел IV. СУВЕРЭННАЯ РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ .......................................168
Лекцыя 11. Суверэнная Рэспубліка Беларусь ва ўмовах глабалізацыі.................................................................168
Літаратура да чацвёртага раздзела...............................183
III. ПРАКТЫКУМ ...........................................................186
3.1. Агульная методыка правядзення практычных заняткаў ...................................................186
3.2. Метадычныя рэкамендацыі да практычных заняткаў для студэнтаў дзённай формы навучання..........................192
3.3. Метадычныя парады для падрыхтоўкі да практычных заняткаў для студэнтаў завочнай формы навучання ........211
3.4. Кіруемая самастойная работа па гісторыі Беларусі для студэнтаў дзённай формы навучання.........................220
3.5. Навукова-даследчыцкая работа студэнта па гісторыі Беларусі...........................................................237
3.6. Тэксты і трэніровачныя заданні па гісторыі Беларусі.........................................................................241
IV. КАРОТКІ ТЭРМІНАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК......................259
V. АСНОЎНЫЯ ДАТЫ І ПАДЗЕІ Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ 285
VI. НАВУКОВАЯ І ВУЧЭБНАЯ ЛІТАРАТУРА ПА КУРСЕ..291
VII. ТЭМЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЫНІКОВАГА ІСПЫТУ .......................................................................300

# АД АЎТАРА

“Гісторыя – гэта фундамент, на каторым будуецца жыццё народа. І нам, каб адбудаваць сваё жыццё, трэба пачаць з фундамента, каб будынак быў моцны”, – такімі злабадзённымі і сёння словамі пачынае сваю “Кароткую гісторыю Беларусі” дзеяч беларускага адраджэння пачатку ХХ ст. Вацлаў Ластоўскі. І сапраўды, без ведання сваёй гісторыі, сваіх каранёў народ не мае будучыні.

Курс “Гісторыя Беларусі” ўведзены ў праграмы сярэдніх і вышэйшых навучальных установ у пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя, калі наша рэспубліка стала на шлях пабудовы суверэннай дзяржавы. Нягледзячы на тое, што ў межах школьнай праграмы вывучэнню гэтай дысцыпліны надавалася немалая ўвага, вывучэнне студэнтамі курса “Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый” займае важнае месца ў агульнай сістэме падрыхтоўкі сучаснага дыпламаванага спецыяліста.

Галоўнай мэтай вучэбнай дысцыпліны ў вышэйшай установе з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў сістэмы ведаў аб асноўных этапах этнічнай гісторыі Беларусі, сацыяльна-палітычным, эканамічным, культурным жыцці беларускага народа ў кантэксце гісторыі сусветных цывілізацый. Новая метадалогія гісторыі зыходзіць з пазіцый неабходнасці ўсебаковага аналізу падзей і з’яў на базе рэчаісных дакументаў, прыняцця гістарычнага працэсу такім, які ён быў, неабходнасці вывучэння нацыянальнай гісторыі ў цеснай сувязі з гісторыяй сусветных цывілізацый. Таму ў дадзеным вучэбна-метадычным комплексе аўтар імкнулася адлюстраваць комплексны падыход.

**Структура вучэбна-метадычнага комплекса.** Дадзены вучэбна-метадычны комплекс па гісторыі Беларусі мае складаную структуру і ўключае ў сябе наступныя блокі:

1) Праграма курса “Гісторыя Беларусі у кантэксце сусветных цывілізацый” знаёміць са структурай курса ў ВНУ, вызначае мэту і задачы вывучэння дысцыпліны, утрымлівае праграму курса (назвы тэмаў і кароткі іх змест).

2) Кароткі курс лекцый ахоплівае асноўныя тэарэтычныя праблемы ўсяго курса; вылучаюцца базавыя тэрміны і паняцці;

заканчваецца кожная лекцыя пытаннямі для самакантролю пераважна аналітычнага характару. Напрыканцы кожнага раздзела змешчаны спіс асноўнай літаратуры (артыкулы, манаграфіі, падборкі дакументаў) па праблематыцы канкрэтнага перыяду.

3) Практыкум, які прадстаўляе трэці блок вучэбна-метадычнага комплекса, складаецца з кароткага апісання методыкі падрыхтоўкі да практычных заняткаў па гісторыі, знаёміць з рознымі формамі практычных заняткаў. Для студэнтаў дзённай і завочнай (асобна) формаў навучання вызначаны тэмы заняткаў з кароткімі метадычнымі парадамі і спісам вучэбна-метадычнай літаратуры да кожнага з іх. Спіс рэкамендаванай літаратуры складаецца пераважна з выданняў, шырока даступных сённяшняму студэнту як на беларускай, так і на рускай мове. Асобна для студэнтаў дзённай формы навучання прыкладзены раздзел кіруемай самастойнай работы, а таксама рэкамендацыі па такой пазааўдыторнай форме работы, як навукова-даследчыцкая работа студэнта. Таксама ў практыкуме змешчаны тэсты і трэніровачныя заданні па асноўных раздзелах курса гісторыі Беларусі, што абумоўлена шырокай распаўсюджанасцю практыкі тэсціравання ў сучаснай вышэйшай школе.

4) Важнай часткай выдання з’яўляецца кароткі тэрміналагічны слоўнік па базавых паняццях курса.

5) Асобнай часткай даведачнага апарату вучэбна-метадычнага комплекса вылучаецца храналагічная табліца асноўных дат і падзей у гісторыі Беларусі.

6) Спіс літаратуры па ўсім курсе ўтрымлівае навейшыя падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, а таксама энцыклапедыі і даведнікі па гісторыі Беларусі.

7) Завяршаецца выданне спісам тэм для падрыхтоўкі да выніковага іспыту па курсе “Гісторыя Беларусі (ў кантэксце сусветных цывілізацый)”.

# ПРАДМОВА

Старажытныя рымляне казалі: “Гісторыя – настаўніца жыцця”. Веданне гісторыі ва ўсе часы лічылася рысай добрага густу. Напрыклад, французскі кароль Генрых IV Вялікі яшчэ ў другой палове XVI ст. заявіў: “Пра што можна размаўляць з чалавекам, калі той не ведае гісторыі?” Вядомы нямецкі царкоўны рэфарматар М. Лютэр быў нават больш прамалінейны: “Цкаванне гісторыі ёсць адметная рыса татарскага і цыклапічнага варварства, д’ябальскае глупства!” Словы дзвюх згаданых асоб не згубілі сваёй актуальнасці і сёння. Вывучэнне гісторыі сваёй краіны садзейнічае фарміраванню больш глыбокага разумення сучаснай сацыяльна-палітычнай, эканамічнай і культурнай сітуацыі ў краіне. Атрыманыя раней веды па гісторыі пастаянна ўзбагачаюцца фактамі, раней невядомымі, а новыя пакаленні пераасэнсоўваюць факты мінулага. Ва ўсе часы веданне гісторыі з’яўлялася яркім паказчыкам цывілізаванасці. Да таго ж атрыманыя веды спатрэбяцца студэнтам пры вывучэнні спецыяльных, у тым ліку эканамічных і праваэнаўчых, дысцыплін.

***Прадмет гісторыі.*** Гісторыя вывучае мінулае чалавецтва і накіравана на фарміраванне сістэмы ведаў, неабходных для адукаванага чалавека. Асаблівасць гісторыі вынікае з таго, што яе галоўнай мэтай з’яўляецца вывучэнне чалавечай паўсядзённасці як у прасторы, так і ў часе. Гісторыя дапамагае даведацца пра мінулае сваёй радзімы, больш дакладна вызначыць яе месца сярод іншых краін і народаў.

***Метадалогія гісторыі.*** Гісторыя як навука мае асабістае кола крыніц, якія ўмоўна можна падзяліць на пісьмовыя, вусныя, археалагічныя, этнаграфічныя, лінгвістычныя, кіно-фона-фотааўдыявіртуальныя дакументы і г. д. Яна абапіраецца на навуковую метадалогію. На сённяшні дзень прынята вылучаць наступныя метады:




Той ці іншы гісторык выбірае для сваёй працы тую метадалогію, якая адпавядае тэматыцы і праблематыцы даследавання, наяўнаму колу крыніц і, нарэшце, асабістым навуковым поглядам.

Сённяшняя беларуская гісторыя ў вывучэнні гістарычнага працэсу карыстаецца цывілізацыйным і фармацыйным падыходамі. Аптымальным падаецца разумнае іх спалучэнне, што і прадстаўлена ў дадзеным вучэбным выданні.